Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________ В. Р. Языковіч
«___» _____________ 2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

# СОЛЬНАЕ І КАМЕРНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЕ ВЫКАНАЛЬНІЦТВА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-18 01 01*
*Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка),*
*спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02Інструментальная музыка духавая*

2020

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-18 01 01 2013, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці «народная творчасць (па напрамках)». Рэгістрацыйны нумар С 18 1-09/13 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*А. Л. Карацееў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*С. М. Касцючэнка,* начальнік ваенна-аркестравай службы Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь;
кафедра драўляных духавых інструментаў установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 25.05.2017 г.);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 22.04.2018 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Л. Карацееў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва» з'яўляецца састаўной часткай агульнамузычнай падрыхтоўкі студэнтаў. У дадзенай праграме прадстаўлены вучэбныя патрабаванні да выканаўцаў на лабіяльных, язычковых, амбушурных і ўдарных музычных інструментах, па якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка студэнтаў напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка), спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 Інструментальная музыка духавая.

Змест вучэбнай праграмы прадугледжвае фарміраванне прафесійных кампетэнцый:

1) ПК-1. Ствараць творчыя калектывы (*ансамбль духавых інструментаў; аркестр духавых і ўдарных інструментаў*).

2) ПК-3. Забяспечваць шматбаковыя сувязі з грамадкасцю ў працэсе работы, удзельнічаць у распрацоўцы рэкламнай і друкаванай прадукцыі.

3) ПК-4. Рыхтаваць даклады, паведамленні і іншую дакументацыю ў галіне народнай творчасці і ўдзельнічаць у іх рэпрэзентацыі.

4) ПК-14. Аналізаваць перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народнай творчасці.

5) ПК-17. На навуковай аснове арганізоўваць сваю творчую прафесійную дзейнасць, валодаць найноўшымі навуковымі распрацоўкамі, а таксама сучаснай інфармацыяй у сферы мастацкай культуры.

6) ПК-18. Ажыццяўляць нагляд за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці ў мэтах іх аховы і пераемнасці.

7) ПК-19. Ведаць прынцыпы і прыёмы збірання, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі для правядзення навуковых даследаванняў у галіне народнай творчасці.

8) ПК-21. Удасканальваць методыкі работы з творчымі калектывамі, распрацоўваць вучэбныя праграмы, вучэбна-метадычныя комплексы і іншую вучэбную літаратуру.

9) ПК-23. Планаваць рэпертуар уласных мастацкіх (музычных) твораў.

10) ПК-24. Працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11) ПК-25. Арганізоўваць этапы працэсу выканання мастацкіх (музычных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкіх густаў насельніцтва.

12) ПК-27. Рабіць уласныя аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пералажэнні для харавых калектываў, аркестраў, ансамбляў.

13) ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму, ствараць асабістыя варыянты адаптацыі музычных твораў у выглядзе камп'ютарнай версіі на электронных носьбітах у розных формах, жанрах і стылях народнай, акадэмічнай, эстраднай музыкі для музычных калектываў розных творчых кірункаў (музычных, музычна-харэаграфічных, музычна-харавых).

14) ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні харавых (інструментальных) калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі, актыўна весці музычна-выканальніцкую і музычна-асветніцкую дзейнасць, выконваць праграмы, у склад якіх уваходзяць featureнахарактарныя творы ў розных формах, жанрах і стылях народнай, акадэмічнай, эстраднай музыкі з улікам пошуку і ўвасаблення мастацкай інтэрпрэтацыі музычных твораў.

Галоўнай *мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва» з'яўляецца развіццё выканальніцкіх навыкаў студэнтаў у форме сольнага выканальніцтва на сваім базавым інструменце і ў форме камерна-інструментальнага выканальніцтва ў адпаведнасці з падрыхтоўкай будучых спецыялістаў да асабістай творчай дзейнасці з аматарскімі ансамблямі і аркестрамі духавых і ўдарных інструментаў. Засваенне студэнтамі сутнасці асноў выканальніцкага майстэрства на духавых і ўдарных інструментах прадугледжвае сувязь з *музычна-тэарэтычнымі вучэбнымі дысцыплінамі* – «Тэорыя музыкі (гармонія, паліфанія, аналіз музычных форм)»; *дысцыплінамі спецыялізацыі* – «Сусветная і нацыянальная гісторыя, тэорыя выканальніцтва на духавых і ўдарных інструментах», «Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін», «Методыка работы з аркестрам і ансамблем», «Вучэбна-педагагічны і канцэртны рэпертуар», «Інструментазнаўства і інструментоўка»; *творча-практычнымі дысцыплінамі спе-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*цыялізацыі* – «Аркестравае выканальніцтва», «Ансамблевае выканальніцтва» і інш.

Падчас навучання студэнты маюць магчымасць вырашаць *наступныя задачы* па асабістай выканальніцкай падрыхтоўцы:

*1) атрымаць грунтоўныя веды ў сферы духавога музычнага мастацтва* па ўсіх існуючых формах выканальніцтва: сольнае, ансамблевае, аркестравае;

*2) развіць і сфарміраваць адпаведныя асабістыя творча-выканальніцкія навыкі і ўменні*, а таксама *навыкі і ўменні работы ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля* з мэтай выкарыстання гэтых якасцей у будучай прафесійнай самастойнай творчай дзейнасці;

*3) арыентавацца ў выбары неабходных творча-выканальніцкіх вырашэнняў* у класічных творах, у творах сучасных кампазітараў пад кіраўніцтвам выкладчыка для асабістага базавага духавога меднага інструмента і камерна-інструментальнага выканальніцтва падчас падрыхтоўкі акадэмічнай праграмы для іспытаў (кантрольны ўрок, тэхнічны залік, залік ці экзамен, дзяржаўны экзамен);

*4) вызначаць адпаведныя вучэбныя заданні* падчас арганізацыі асабістых самастойных заняткаў;

*5) усвядоміцьдля сябесутнасць папулярнасці і мастацка-выразных асаблівасцей духавога выканальніцтва і выканальніцтва на ўдарных інструментах*;

*ведаць:*

*1. Тыпалогію, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці духавых і ўдарных інструментаў* (іх класіфікацыя; разнастайнасць; мастацка-выканальніцкія і выразна-тэхнічныя магчымасці; строй; інтанацыя; дыяпазон і г. д.).

*2. Спецыфіку сольнага ікамерна-інструментальнага выканальніцтва* (*solo*; *solo*ў суправаджэнні фартэпіяна; *solo*ў суправаджэнні інструментальнага ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў).

*3. Псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя аспекты засваення духавых і ўдарных інструментаў* у адпаведнасці з атрыманнем кваліфікацыі «Музыкант» (арыентацыя пры вызначэнні таго ці іншага неабходнага дыдактычнага прынцыпу ў працэсе заняткаў на музычным інструменце; вызначэнне асноўных кірункаў заняткаў, іх змест і адпаведны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб’ёмзаданняў; выкарыстанне неабходных сучасных тэхнічных сродкаў і г. д.).

*4. Віды і неабходныя этапы работы над музычнымі творамі* (папярэдняя аналітычная работа па вывучэнні вызначанага для працы матэрыялу; музычна-выканальніцкі аналіз вывучаемых твораў; змест адпаведнага графіка па вывучэнні найбольш складаных фрагментаў выконваемых твораў; асноўныя этапы аналізу выканальніцкіх цяжкасцей і іх паслядоўнасць падчас працы над творам; прынцыпы работы над вывучаемымі творамі ці іх камбінацыямі).

*5. Мастацка-выразныя магчымасці духавых і ўдарных інструментаў падчас выканання solo, кантрапункта, музычнай арнаментыкі, сучасных прыёмаў ігры і г. д.*

*6. Асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах і іх сацыякультурная значнасць (удзел у святах, фестывалях, канцэртах музычнага мастацтва; сцэнічная культура выканаўцы і скасаванне такіх негатыўных якасцей, як сцэнічнае хваляванне, эмацыянальная статычнасць і г. д.).*

*7. Расшыфроўку і асаблівасці выканання музычнай арнаментыкі* (трэлі, групета, мардэнт і г. д.).

*8. Асаблівасці арганізацыі самастойныхпапярэдніхзаняткаў без выкладчыка з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату* да выканання заданняў падчас сустрэчы ў аўдыторыі з выкладчыкам ці да заняткаў на рэпетыцыі ансамбля, аркестра;

*умець:*

*1. Ажыццяўляць пастаянны кантроль і неабходную карэктуру інтанавання* ў працэсе сольнага выканальніцтва і ігры з канцэртмайстрам.

*2. Самастойна настройваць асабісты інструмент* з дапамогай цюнера ці фартэпіяна для самастойных пазааўдыторных заняткаў, заняткаў з выкладчыкам на індывідуальных занятках у класе.

*3. Дасягнуць неабходнага балансу гучання* ў працэсе сумеснага выканання твора з суправаджэннем фартэпіяна ў адпаведнасці з дынаміка-акустычнай асаблівасцю базавага духавога ці ўдарнага інструмента.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4. Прытрымлівацца дакладнага метрарытму* падчас выканання на базавым духавым ці ўдарным інструменце (інструктыўны матэрыял; вучэбна-педагагічны ці канцэртны рэпертуар; сольныя творы ці творы для ансамбля, аркестра).

*5. Арыентавацца ў вызначэнні спецыфікі пабудовы і выканання фразіроўкі* (а таксама матываў, перыядаў, кантрапункта, рэчытатыву).

*6. Арганізоўваць самастойныяпапярэдніязаняткі без выкладчыка з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату* да выканання заданняў падчас сустрэчы ў аўдыторыі з выкладчыкам ці да заняткаў на рэпетыцыі ансамбля, аркестра.

*7. Выконваць незнаёмыя музычныя творы рознай ступені складанасці і форм у працэсе чытання нот з ліста.*

*8. Ажыццяўляць адпаведную карэктуру інтанавання,* якая абумоўлена неабходнасцю пастаяннага кантролю падчас ігры з канцэртмайстрам на аўдыторных занятках з выкладчыкам.

*9. Састаўляць планы самастойнай работы над інструктыўным матэрыялам* (практыкаванні, гамы, эцюды).

*10. Састаўляць планы самастойнай работы над музычнымі творамі* па індывідуальнай падрыхтоўцы (камерна-інструментальныя творы кампазітараў-класікаў і сучасных аўтараў, у тым ліку і беларускіх);

*валодаць:*

*1.* Тэхнікай выканання мажорных, мінорных, абаротных гам з улікам выкарыстання розных штрыхавых камбінацый.

*2.* Тэхнікай выканання эцюдаў на розныя выканальніцкія задачы і віды выканальніцкай тэхнікі.

*3.* Асаблівасцямівыканання сольных, камерна-інструментальных твораў з улікам іх жанрава-стылявой спецыфікі.

*4.* Аналізам сольных, камерна-інструментальных цяжкасцейу вывучаемых творах і вызначэннем шляхоў іх скасавання падчас заняткаў.

*5. Выкананнем варыянтаў, трактовак, інтэрпрэтацый, рэдакцый музычных твораў* (ажыццяўленне параўнальнага аналізу музычнага матэрыялу з улікам вывучэння арыгінала твораў ці яго адаптацыі – нотныя выданні, відэазапісы і г. д.).

*6. Вызначэннем абавязковых папярэдніх заданняў з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату* да заняткаў у аўдыторыі з выкладчыкам ці да заняткаў на рэпетыцыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ансамбля, аркестра:папярэднія практыкаванні, уключаючы варыянтыкантраснага супастаўлення кантыленных фрагментаў з складанымі тэхнічнымі камбінацыямі; вызначэнне выканальніцкіх задач па засваенні ўсіх відаў работы над гамамі, дасягненне дакладнага выканання абертонаў («узыходзячы» і «зыходзячы»), чаргаванне камбінацый на падставе «скачкападобных» варыянтаў.

*7) Вызначэннем ансамблевых ці аркестравых цяжкасцей* і работай над іх дакладным выкананнем на духавых ці ўдарных інструментах.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва» ўсяго прадугледжана 668 гадзін, з якіх 258 – аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Асноўная мэта, задачы, патрабаванні і змест дысцыпліны «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва» з улікам развіцця выканальніцкага майстэрства на духавых і ўдарных інструментах у сістэме вышэйшай адукацыі. Патрабаванні да выканання заданняў па індывідуальнай падрыхтоўцы студэнтаў на базавым музычным духавым ці ўдарным інструменце, формы бягучага кантролю і выніковых іспытаў.

Месца і роля дысцыпліны «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва» ў сістэме падрыхтоўкі кіраўнікоў аматарскіх аркестраў (ансамбляў) духавых інструментаў, а таксама выкладчыкаў музыкі навучальных устаноў. Узаемасувязь дысцыпліны «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва» з музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі, асноўнымі дысцыплінамі спецыялізацыі і творча-практычнымі дысцыплінамі спецыялізацыі.

## Тэма 1. Дыягностыка выканальніцкіх здольнасцей і аптымізацыя навучальнага працэсу

Вызначэнне выканальніцкага ўзроўню ігры на духавых і ўдарных інструментах на падставе розных відаў практыкаванняў (размінка; выкананне абертонаў на духавых інструментах; выкананне розных метрарытмічных камбінацый выканаўцамі на ўдарных інструментах; выкананне музычных фрагментаў у высокай тэсітуры гучання на драўляных і медных духавых інструментах і г. д.). Вынікі і аналіз дыягностыкі папярэдняй падрыхтоўкі: сфарміраванасць амбушура, валоданне выканальніцкім дыханнем, параметры дыяпазону, артыкуляцыя, тэхніка валодання асноўнай і дадатковай аплікатурай на драўляных і медных духавых інструментах (ці адпаведнымі пазіцыямі выканання на трамбоне), каардынацыя рук, валоданне тэхнічнымі прыёмамі і дакладнасць выканання метрарытму выканаўцамі на ўдарных інструментах. Падрыхтоўка музычных фрагментаў (эцюд, камерна-інструментальны музычны твор ці аркестравая партыя) з мэтай выяўлення навыкаў чытання нот з ліста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўка тэставых заданняў, якія спрыяюць фарміраванню навыкаў і ўменняў самастойнай работы студэнтаў з інструктыўным матэрыялам (павольныя тэмпы, штрыхавыя і метрарытмічныя камбінацыі, дынамічныя градацыі і да т. п.), эцюдамі на розныя віды тэхнікі з улікам метрарытмічных разнастайнасцей; сольнымі, камерна-інструментальнымі музычнымі творамі ці іх фрагментамі, аркестравымі партыямі з мэтай вызначэння адпаведнай пабудовы музычнай фразіроўкі, дакладнага інтанавання, дынамікі, метрарытму і г. д.

### Тэма 2. Асаблівасці працэсу фарміравання выканальніцкага апарату ў першы перыяд навучання ў вышэйшай установе і шляхі яго ўдасканалення

Выканальніцкі апарат: сутнасць, састаўныя кампаненты і іх значэнне. Праблемы ўдасканалення амбушура выканаўцы на духавых інструментах. Сутнасць паняцця «апертура» і спецыфіка яе далейшага развіцця. Вызначэнне рацыянальнай пастаноўкі муштука на духавых інструментах. Роля сістэмных заняткаў над падоўжанымі і філіраванымі гукамі ў працэсе ўдасканалення выканальніцкіх навыкаў. Вызначэнне адпаведных заданняў па засваенні інструктыўнага матэрыялу і яго роля ў фарміраванні тэхнічнага майстэрства ігры на духавых і ўдарных інструментах.

### Тэма 3. Арганізацыйна-метадычныя асаблівасці правядзення індывідуальных заняткаў выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах

Роля індывідуальных заняткаў у працэсе вывучэння дысцыпліны «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва». Вызначэнне асноўных этапаў арганізацыі індывідуальных заняткаў студэнтаў з выкладчыкам:

– папярэдняя падрыхтоўка да заняткаў (актывізацыя выканальніцкага дыхання без музычнага інструмента: практыкаванні па сістэме «*bazing*» на губах і пры дапамозе муштука; выкананне практыкаванняў штрыхом «*legato*» па прынцыпе «слізгання» гукаў па абертонах);

– асноўная частка заняткаў (ажыццяўленне кантролю па выкананні студэнтам папярэдніх заданняў па дысцыпліне «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва», выяўленне магчымых недахопаў і шляхі іх скасавання; работа над інструк-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыўным матэрыялам і рознымі відамі выканальніцкай тэхнікі, работа над камерна-інструментальнымі музычнымі творамі, аркестравымі партыямі);

– заключная частка заняткаў (ступень засваення студэнтам аб'ёму заданняў у час правядзення індывідуальных заняткаў з выкладчыкам; вызначэнне магчымых дадатковых практыкаванняў і каментарыяў да выканання неабходнага аб'ёму заданняў).

## Тэма 4. Спецыфіка і арганізацыйна-метадычныя аспекты развіцця навыкаў арганізацыі самастойных заняткаў

Сутнасць і месца самастойных пазааўдыторных заняткаў у працэсе вывучэння дысцыпліны «Сольнае і камерна-інструментальнае выканальніцтва». Асноўныя задачы па вызначэнні зместу індывідуальных самастойных заняткаў. Фарміраванне ўменняў падбору неабходнага музычнага матэрыялу для індывідуальных самастойных заняткаў.

Асноўныя этапы арганізацыі пазааўдыторных заняткаў:

– ранішнія заняткі па папярэдняй падрыхтоўцы выканальніцкага апарату (практыкаванні па актывізацыі выканальніцкага дыхання без музычнага інструмента; абавязковыя заняткі па сістэме выканання падоўжаных гукаў, работа над практыкаваннямі штрыхом «legato» па прынцыпе лёгкага «слізгання» па абертонах гукаў у павольных і хуткіх тэмпах);

– работа над інструктыўным матэрыялам (тэхнічныя практыкаванні; розныя віды работы над эцюдамі);

– работа над музычнымі творамі (рознахарактарныя; разнажанравыя камерна-інструментальныя творы; аркестравыя партыі);

– развіццё навыкаў адаптацыі музычных твораў для духавых і ўдарных інструментаў (самастойная апрацоўка і пералажэнне музычных твораў для асабістага базавага інструмента).

## Тэма 5. Асаблівасці выкарыстання асноўных тыпаў выканальніцкага дыхання ў працэсе сольнага і камерна-інструментальнага выканальніцтва на духавых інструментах

Параўнальны аналіз розных тыпаў выканальніцкага дыхання і іх асаблівасці ў працэсе сольнага і камерна-інструментальнага выканальніцтва на духавых інструментах. Сутнасць і спецыфіка выкарыстання асноўнага змешанага тыпу дыхання як са-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стаўной часткі выканальніцкага апарату. Распрацоўка розных відаў заданняў па развіцці выканальніцкага дыхання (папярэдні этап заняткаў без музычнага інструмента). Падрыхтоўка практыкаванняў для сістэматычных заняткаў па развіцці выканальніцкага дыхання на музычным інструменце. Узаемаабумоўленасць пабудовы музычнай фразы і выканальніцкага дыхання. Тэхналагічны эфект перманентнага дыхання і яго магчымае эпізадычнае ўкараненне ў выканальніцкую практыку. Дыферэнцыяцыя выканальніцкага дыхання ў залежнасці ад памеру мензуры на духавых лабіяльных, язычковых і медных інструментах.

## Тэма 6. Работа над артыкуляцыяй і тэхналогія ўдасканалення розных відаў выканальніцкай тэхнікі на духавых і ўдарных інструментах

Сутнасць артыкуляцыі і яе месца ва ўдасканаленні выканальніцкага майстэрства. Састаўныя кампаненты артыкуляцыйнага працэсу пры ігры на духавых інструментах. Узаемасувязь артыкуляцыйных кампанентаў і асаблівасці працэсу рэзанансу выканаўцы. Сукупнасць фанетычных галосных і зычных гукаў у артыкуляцыйным працэсе і іх роля ва ўдасканаленні якаснага тэмбрава-каларыстычнага і дынамічнага гучання. Вызначэнне неабходных практыкаванняў з мэтай авалодання living рознымі прыёмамі артыкуляцыі.

Паняцце «выканальніцкая тэхніка» і яе састаўныя кампаненты. Спосабы развіцця выканання «дробнай выканальніцкай тэхнікі» (папярэдні аналіз музычнага матэрыялу і вызначэнне найбольш складаных фрагментаў; работа па ўдасканаленні аплікатурнай тэхнікі ў складаных пасажах; падбор адпаведных практыкаванняў). Паняцце «тэхніка атакі языка», яе тэхналогія і разнастайнасці (спецыфіка атакі языка ў адпаведнасці з характарам і асаблівасцямі штрыхавых камбінацый у музычных творах; асаблівасці выканання дадатковай атакі языка (падвоенная – патроенная) «staccato»; падбор практыкаванняў з выкарыстаннем розных спосабаў атакі языка). Развіццё навыкаў выканання з улікам максімальнага аб'ёму гучання адпаведнага духавога інструмента (падбор практыкаванняў для засваення нізкага рэгістра; тэхналогія засваення верхняй тэсітуры). Тэхналогія развіцця выканальніцкай тэхнікі (спосабы актывізацыі дыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фрагмы; пашырэнне аб’ёму выканальніцкага дыхання пры дапамозе падоўжаных гукаў; падбор практыкаванняў па фарміраванні навыкаў лёгкага «слізгання» з рэгістра ў рэгістр пры найменшым удзеле языка «legato» па развіцці выканальніцкага дыхання. Развіццё навыкаў выканання на ўдарных інструментах з улікам розных відаў выканальніцкай тэхнікі і выканальніцкіх прыёмаў.

### Тэма 7. Месца, метады засваення гам і іх роля ў сістэме навучання выканаўцаў на духавых інструментах

Работа над гамамі як неабходная і абавязковая ўмова па фарміраванні і развіцці выканальніцкіх навыкаў і ўменняў. Сістэма арганізацыі заняткаў па вывучэнні розных гам у адпаведнасці з выканальніцкім дыяпазонам (асаблівасці пабудовы і выканання мажорных, мінорных і абаротных гам у розных метрарытмічных і штрыхавых камбінацыях); азнаямленне з цэлатоннай, дыятанічнай гамамі; асноўныя задачы па выкананні арпеджыа, Т3-5, Д-7, VII-7 і іх пераварочваннем. Развіццё выканальніцкіх навыкаў у працэсе засваення храматычнай гамы ад розных нот. Роля абаротных гам у працэсе развіцця выканальніцкіх уменняў і засваення неабходных практыкаванняў з рознымі тэмпамі, метрарытмічнымі камбінацыямі і штрыхамі.

### Тэма 8. Штрыхі як сродак музычнай выразнасці: сутнасць, асаблівасці выканання і спецыфіка дасягнення адзінай штрыхавой асновы ў камерна-інструментальным выканальніцтве

Штрыхі: сутнасць, вызначэнне, функцыянальныя асаблівасці і спецыфіка выкарыстання ў духавой музыцы. Параўнальны аналіз, тэхналогія выканання штрыхоў на розных музычных інструментах (фартэпіяна, струнныя, духавыя). Спецыфіка тэхналогіі выканання асноўных і дадатковых штрыхоў на духавых медных інструментах. Асаблівасці ўдасканалення тэхнікі і навыкаў выканання штрыхоў пры дапамозе цвёрдай атакі языка («*detache*», «*staccato*», «*staccatissimo*», «*marcato*», «*martele*»), асаблівасці пачатку гуку пры выкананні штрыха «*legato*». Асаблівасці ўдасканалення тэхнікі і навыкаў выканання штрыхоў пры дапамозе мяккай атакі языка («*nonlegato*», «*portato*»), асаблівасці пачатку гуку пры выкананні штрыха «*legato*».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё ўменняў выкарыстання дадатковых спецыфічных штрыхоў і выканальніцкіх прыёмаў пры ігры на духавых інструментах («*frullato*», падвоенае і патроенае «*staccato*», «*portamento*», «*glisser*»).

## Тэма 9. Сутнасць, разнастайнасці і сістэма засваення дынаміка-акустычнай спецыфікі духавых і ўдарных інструментаў

Дынаміка як сродак музычнай выразнасці: сутнасць і спосабы выкарыстання. Паняцце аб рэльефе, фоне, аб’ёме і балансе гучання на духавых і ўдарных інструментах. Параўнальны аналіз дынаміка-акустычнага гучання лабіяльных, язычковых, медных духавых і ўдарных інструментаў. Прынцыпы кантрасту дынамікі гучання на духавых і ўдарных інструментах.

Узаемасувязь дынамікі і музычнай фактуры ў працэсе выканальніцтва ўскладзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Развіццё навыкаў устаранення дынаміка-акустычнага дысбалансу гучання на духавых і ўдарных інструментах у складзе аднародных, роднасных і змешаных складаў ансамбляў, аркестраў, а таксама паміж групамі інструментаў. Фарміраванне ўменняў дасягнення неабходнага дынаміка-акустычнага гучання (выкарыстанне адпаведных практыкаванняў розных відаў). Тэхналогія засваення падоўжаных гукаў на духавых інструментах у розных дынамічных градацыях.

Тэхналогія засваення філіраваных гукаў і іх роля ў фарміраванні ўменняў валодання рознымі дынаміка-акустычнымі камбінацыямі.

Развіццё навыкаў выканання прыёмаў пры раптоўнай змене дынаміка-акустычнага гучання на ўдарных інструментах.

## Тэма 10. Работа над фразіроўкай у музычных творах

Паняцце «фразіроўка», яе сутнасць, значнасць і роля ў музычна-выканальніцкім мастацтве. Асноўныя патрабаванні да пабудовы музычнай фразіроўкі і яе састаўныя элементы ў музычных творах розных жанраў. Развіццё навыкаў выканання розных элементаў фразіроўкі ў адпаведнасці з асаблівасцямі драматургіі твора:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– матыў;
– фраза;
– сказ;
– перыяд.

Музычная фразіроўка як эфектыўны сродак мастацка-выканальніцкай выразнасці і тэхналогія яе пабудовы ў адпаведнасці з жанрава-стылявымі асаблівасцямі твора (арыгінал ці яго адаптацыя – пералажэнне, апрацоўка, інструментоўка і г. д.). Фарміраванне ўменняў тэмпавых суадносін у музычнай фразе (прытрымліванне адзінага тэмпу на працягу ўсёй фразы; асаблівасці работы над метрарытмічнымі дакладнасцямі выканання фразы; спецыфіка выканання з улікам агогікі).

Сутнасць, асаблівасці пабудовы, прынцыпы засваення фразіроўкі ў адпаведнасці з музычнай драматургіяй твора ў працэсе сольнага і камерна-інструментальнага выканальніцтва на духавых інструментах.

## Тэма 11. Сутнасць, шляхі дасягнення дакладнай інтанацыі на духавых інструментах і віды яе карэкціроўкі

Асаблівасці інтанавання ў працэсе выканальніцтва на духавых інструментах (канструктыўныя і тэхналагічныя недахопы і шляхі іх пераадольвання). Сутнасць дакладнага інтанавання.

Асноўныя віды настройкі інструментаў і іх спецыфіка (*мела-дычная*, *гарманічная*).

Выкарыстанне розных спосабаў настройкі духавых інструментаў (*пры дапамозе цюнера; пры дапамозе слыху; па камертоне; па гучанні другога інструмента* – фартэпіяна ці духавога інструмента).

Асаблівасці карэкціроўкі інтанавання ў працэсе сольнага ці сумеснага выканальніцтва: 1) прынцып ладатанальнага прыцягнення; 2) выкарыстанне дадатковай аплікатуры; 3) змяненне параметраў апертуры і амбушура; 4) карэкцыя экспрэсіі выканальніцкага дыхання.

## Тэма 12. Асаблівасці выканання складаных метрарытмічных пабудоў

Паняцці «метр» і «рытм», іх сутнасць у музычным мастацтве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метрарытм як адзін з галоўных элементаў і мастацкіх сродкаў у музыцы. Фармаўтваральнае значэнне рытму, вывучэнне тыпавых рытмаформул і розных іншых варыянтаў метрарытмічных асаблівасцей.

Развіццё навыкаў выканання розных метрарытмічных камбінацый (музычныя практыкаванні, гамы, эцюды, вучэбна-педагагічны і канцэртны рэпертуар).

Дасягненне дакладнасці метрарытму ў калектыўнай ігры ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

## Тэма 13. Развіццё навыкаў чытання нот з ліста ў працэсе засваення вучэбнага і канцэртнага рэпертуару

Чытанне нот з ліста як неабходная ўмова развіцця выканальніцкіх навыкаў па засваенні неабходнага вучэбнага і канцэртнага рэпертуару. Навыкі чытання нот з ліста і іх значнасць у падрыхтоўцы выканаўцаў надухавых інструментах.

Развіццё выканальніцкіх навыкаў інтэнсіўнага засваення музычнага матэрыялу з мэтай пашырэння і засваення вучэбна-педагагічнага і канцэртнага рэпертуару. Спосабы развіцця навыкаў чытання нот з ліста (спантаннае выкананне і чытанне незнаёмых музычных фрагментаў; практыкаванні ігры незнаёмых музычных фрагментаў у розных тэмпах – ад павольных да хуткіх; закрыццё часткі нотнага тэксту ў працэсе ігры).

Актывізацыя і развіццё музычных навыкаў і здольнасцей у працэсе чытання нотнага тэксту ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

## Тэма 14. Музычная арнаментыка: праблема расшыфроўкі і тэхналогія выканання ў сольным і камерна-інструментальным выканальніцтве

Сутнасць музычнай арнаментыкі як мастацка-выразнага сродку ў музыцы. Параўнальны аналіз гістарычнай рэфлексіі музычнай арнаментыкі і асаблівасці яе расшыфроўкі з мэтай выканальніцкага ўвасаблення.

Сучасныя разнастайнасці музычнай арнаментыкі і праблемы яе расшыфроўкі для выканаўцаў на духавых інструментах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разнастайнасці мелізмаў і іх расшыфроўка. Сутнасць «*групета*» і асаблівасці яго выканання. Разнавіднасці «*мардэнта*» і іх выканальніцкія трактоўкі. «*Partamento*», «*фаршлагі*», іх разнастайнасці і спецыфіка выканання. Выканальніцкая трактоўка разнавіднасцей трэлей, асаблівасці іх выканання (губная; пры дапамозе вентыляў ці помпавай механікі; пры дапамозе цуга).

## Тэма 15. Этапы вывучэння музычных твораў і асаблівасці іх сольнага і камерна-інструментальнага выканальніцтва

Прынцыпысастаўлення плана работы павывучэнні вучэбна-педагагічных, канцэртных музычных твораў для духавых і ўдарных інструментаў. Этапы работы над інструментальнымі творамі і іх змест.

Этап першапачатковага знаёмства з творам (клавір, аўдыя- і відэазапіс, кампакт-дыск, праслухоўванне трансляцыі сродкамі масавых камунікацый).

Дэталёвы музычна-выканальніцкі аналіз асаблівасцей вывучаемага твора і задача па стварэнні адпаведных музычных вобразаў у працэсе іх сольнага і камерна-інструментальнага выканальніцтва.

Работа над асноўнымі эпізодамі музычнага твора (развіццё навыкаў сумеснага выканальніцтва з улікам тэхнічных ансамблевых цяжкасцей у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў; дынамічны баланс; штрыхі; фразіроўка; выкананне дробнай тэхнікі; інтанацыя і інш.). Тэхналогія засваення нотнага тэксту на памяць.

Шляхі вырашэння музычна-выканальніцкіх задач па стварэнні музычных вобразаў у працэсе вынікoвага этапусольнага і камерна-інструментальнага выканальніцтва на духавых і ўдарных інструментах у адпаведнасці з мастацка-эстэтычным патрабаваннем твораў (арыгінал, пералажэнне і г. д.).

## Тэма 16. Засваенне жанрава-стылявых асаблівасцей сольных і камерна-інструментальных музычных твораў

Вывучэнне асноўных жанрава-стылявых асаблівасцей выканання музычных твораў. Інтэрпрэтацыя старадаўняй музыкі. Расшыфроўка знакаў скарачэння нотнага запісу і мелізмаў. Асаблівасці выканання эстрадных і джазавых твораў з улікам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыфічнай манеры і стылю выканання (лабіяльнае інтанаванне, метрарытм і г. д.). Тэхнічныя сродкі ў працэсе вывучэння жанрава-стылявых асаблівасцей сольных і камерна-інструментальных музычных твораў (выкарыстанне сінтэзатараў і камп'ютарная апрацоўка музычнага матэрыялу з мэтай стварэння фанаграм («-1»). Дасягненне мастацкіх эфектаў шляхам злучэння духавых інструментаў з іншым музычным інструментарыем (традыцыйныя беларускія народныя духавыя і ўдарныя інструменты; эпізадычныя інструменты – фартэпіяна, цымбалы, скрыпка, кантрабас; электрафікаваныя сучасныя музычныя інструменты – разнавіднасці клавішных інструментаў, бас-гітара і інш.).

## Тэма 17. Псіхафізіялагічная і эмацыянальная падрыхтоўка выканаўцы да публічнага выступлення

Роля публічных выступленняў у працэсе выканальніцкай дзейнасці ў фарміраванні мастацкага густу, майстэрства сцэнічнага ўвасаблення музычных твораў.

Разнастайнасць публічных выступленняў выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах і іх асаблівасці (акадэмічны канцэрт, сесійны іспыт, справаздачны канцэрт, удзел у фестывалях, конкурснае выступленне, удзел у сацыякультурных мерапрыемствах і г. д.). Арганізацыйныя пытанні падрыхтоўкі і правядзення канцэртнага выступлення. Эмацыянальна-псіхалагічная падрыхтоўка выканаўцаў да публічнага выступлення, аўтатрэнінг, выкарыстоўванне вопыту папярэдняй канцэртнай дзейнасці.

Жанрава-стылявыя і сацыяльна-ўзроставыя ўмовы выступленняў выканаўцаў на духавых інструментах (дыферэнцыраваны падыход у складанні выконваемай канцэртнай праграмы, разлічанай на розны музычны густ той ці іншай сацыяльнай групы).

Эстэтыка-сцэнічныя ўмовы выступленняў выканаўцаў на духавых інструментах (антураж, сцэнічны выгляд і імідж у адпаведнасці са стылем і эпохай выконваемых твораў).

Пытанні акустыкі і тэхнічна-інструментальнага забеспячэння выступленняў выканаўцаў на духавых інструментах у канцэртнай зале або на пленэры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 18. Выкарыстанне спецыяльнай літаратуры ў працэсе падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах

Вывучэнне спецыяльнай і нотнай літаратуры ў працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва. Разнастайнасць спецыяльнай літаратуры аб асаблівасцях засваення духавых і ўдарных музычных інструментаў: манаграфіі; энцыклапедыі; атласы музычных інструментаў; брашуры; навуковыя, метадычныя зборнікі і артыкулы; спецыяльныя ведамасныя журналы; вучэбна-метадычныя дапаможнікі і г. д.).

Выкарыстанне лепшых айчынных, замежных нотных выданняў для падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных музычных інструментах (нотныя зборнікі; тэматычныя ці серыйныя выданні музычных твораў ці эцюдаў; хрэстаматыі; школы ігры на духавых і ўдарных інструментах; практычныя дапаможнікі; зборнікі практыкаванняў і г. д.).

Вывучэнне музычных запісаў (дыскаграфія, відэазапіс і г. д.) з мэтай іх выкарыстання ў навучальным працэсе ў якасці ілюстрацыі вывучаемых твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## (*дзённая форма навучання*)

| Назва тэм заняткаў | Агульная колькасць гадзін | КСР | Форма кантролю |
|---|---|---|---|
| | індывід. | | |
| Уводзіны | 1 | | |
| Тэма 1. Дыягностыка выканальніцкіх здольнасцей і аптымізацыя навучальнага працэсу | 4 | | |
| Тэма 2. Асаблівасці працэсу фарміравання выканальніцкага апарату ў першы перыяд навучання ў вышэйшай установе і шляхі яго ўдасканалення | 10 | 22 | франтальнае апытанне |
| Тэма 3. Арганізацыйна-метадычныя асаблівасці правядзення індывідуальных заняткаў выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах | 20 | 28 | франтальнае апытанне |
| Тэма 4. Спецыфіка і арганізацыйна-метадычныя аспекты развіцця навыкаў арганізацыі самастойных заняткаў | 10 | 20 | франтальнае апытанне |
| Тэма 5. Асаблівасці выкарыстання асноўных тыпаў выканальніцкага дыхання ў працэсе сольнага і камерна-інструментальнага выканальніцтва на духавых інструментах | 10 | 20 | індывід. заданні |
| Тэма 6. Работа над артыкуляцыяй і тэхналогія ўдасканалення розных відаў выканальніцкай тэхнікі на духавых і ўдарных інструментах | 10 | 20 | індывід. заданні |
| Тэма 7. Месца, метады засваення гам і іх роля ў сістэме навучання выканаўцаў на духавых інструментах | 10 | 60 | індывід. практыкаванні |
| Тэма 8.Штрыхі як сродак музычнай выразнасці: сутнасць, асаблівасці выканання і спецыфіка дасягнення адзінай штрыхавой асновы ў камерна-інструментальным выканальніцтве | 10 | 60 | індывід. заданні |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| Тэма 9.Сутнасць, ранастайнасці і сістэма засваення дынаміка-акустычнай спецыфікі духавых і ўдарных інструментаў | 8 | 40 | індывід. практы-каванні |
| Тэма 10.Работа над фразіроўкай у музычных творах | 25 | 60 | індывід. заданні |
| Тэма 11.Сутнасць, шляхі дасягнення дакладнай інтанацыі на духавых інструментах і віды яе карэкціроўкі | 10 | 40 | індывід. практы-каванні |
| Тэма 12. Асаблівасці выканання складаных метрарытмічных пабудоў | 10 | 1 | індывід. заданні |
| Тэма 13.Развіццё навыкаў чытання нот з ліста ў працэсе засваення вучэбнага і канцэртнага рэпертуару | 20 | 5 | індывід. практы-каванні |
| Тэма 14.Музычная арнаментыка: праблема расшыфроўкі і тэхналогія выканання ў сольным і камерна-інструментальным выканальніцтве | 20 | 2 | індывід. практыка-ванні |
| Тэма 15.Этапы вывучэння музычных твораў і асаблівасці іх сольнага і камерна-інструментальнага выканальніцтва | 25 | 2 | індывід. практы-каванні |
| Тэма 16.Засваенне жанрава-стылявых асаблівасцей сольных і камерна-інструментальных музычных твораў | 25 | 15 | індывід. заданні |
| Тэма 17.Псіхафізіялагічная і эмацыянальная падрыхтоўка выканаўцы да публічнага выступлення | 20 | 5 | індывід. заданні |
| Тэма 18.Выкарыстанне спецыяльнай літаратуры ў працэсе падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах | 10 | 10 | індывід. заданні |
| **Усяго…** | **258** | **410** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

***Флейта***

*1.* Избранные этюды: для флейты /сост. Ю. Должников. – М. : Музыка, 1986. – 47 с.

*2. Мак-Доуэлл, Эдуард.* Лесные картинки. Перелож. для флейты и ф-но / Эдуард Мак-Доуэлл. – М. ; Л. : Музыка, 1966. – 23 с.

*3. Муаз, Марсель.* Школа артикуляции: упражнения и этюды / Марсель Муаз. – СПб. : Композитор, 1999. – 28 с.

*4. Платонов, Н. И.* Этюды: для флейты / Н. И. Платонов; сост. Ю. Должников. – М. : Музыка, 1991. – 64 с.

*5.*Свирель : пьесы для флейты в сопровождении ф-но /сост. и ред. партии флейты В. А. Григорьев. – Минск : Беларусь, 1984. – 55 с.

*6. Тризно, Б. В.* Гаммы, арпеджио и интервалы для развития виртуозной игры на флейте / Б. В. Тризно. – Л. : Музыка, 1967. – 55 с.

*7. Чиарди, Цезари.* Школа игры на флейте / Цезари Чиарди ; ред. и автор биограф. справки Г. Никитин. – Л. : Музыка, 1973. – 56 с.

*8.*Этюды для флейты (на оркестровые темы) / сост. Б. В. Тризно. – Л. : Музыка, 1968. – 72 с.

*9. Ягудин, Ю. Г.* Этюды для флейты / Ю. Г. Ягудин. – М. : Музыка, 1981. – 31 с.

*10. Ягудин, Ю. Г.* Этюды на мелизмы. Для флейты / Ю. Г. Ягудин. – М. : Музыка, 1977. – 24 с.

*11. Fleuret, Daniel.* Coursd’harmoniepratique et raisonnesuivid’unabregehistorique des developpements de cette science a travers les siecles / DanielFleuret. – Lyon : Janin, 1908. – 142 p.

*12.*Flotenetuden / hrsd. von Immanuel Lucchesi. – Leipzig : DVFM, 1981. – 95 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*13. Fursteneu, Anten Bernhard.* 24 Etuden: fur Flote (Bouquets des tons). Op. 125 / Anten BernhardFursteneu; hrsd. von Erich List. – Leipzig : Hofmeister, 1981. – 45 s.

*14. Gariboldi, Giulio.* 30 easy and progressive studies for flute / Giulio Gariboldi. – Budapest : Musica, 1979. – 32 p.

*15. Kordogh, Janos.* Mitteleshwere Technische und Leseubungen fur flote / Janos Kordogh. – Budapest : Musica, 1955. – 40 p.

*16. Kohler, Ernesto.* Studies for flute / Ernesto Kohler; ed. by H. Prohle. – Budapest : Musica, 1980. – № 1.– 18 p.; 1980. –№ 2. – 19 p. ; 1980. –№ 3. – 19 p.

*17. Kohler, Ernesto.* Virtuoz etudok Fuvolara – Virtuosa etuden fur flote / Ernesto Kohler ; op. 75. № 1–3. – Budapest: Musica, 1984. – № 1.– 27 p. ; 1984. – № 2. – 26 p. ; 1983. – № 3. – 31 p.

